# Скарбонка падзей

Газета «Пераходны ўзрост»
Среда, 28 Январь 2015




Мясціны вакол вёскі Збароў Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці апісаў у сваіх творах Уладзімір Караткевіч, а некалі ў Збароўскай старой школе працавала яго маці. Пасяленне — самае старажытнае ў раёне, як і курганы на яго тэрыторыі. А шматлікія помнікі археалогіі і прыроды плануюць
уключыць у склад першага ў Беларусі прыродна-археалагічнага заказніка. Гэтыя і іншыя цікавыя факты і падзеі адлюстраваны ў экспазіцыях школьнага музея воінскай і працоўнай славы.

— У нашым краі сапраўды ёсць чым ганарыцца. Вучні займаюцца навукова-даследчай працай, знаёмяцца з гісторыяй і культурай рэгіёна, збіраюць легенды, паданні, тапонімы і гідронімы, — распавядае кіраўнік, настаўнік біялогіі Андрэй Іванавіч Чарняўскі. — Актыўна друкуюцца артыкулы ў сецiве, рабяты са сваімі работамі ўдзельнічалі ў канферэнцыях раённага і рэспубліканскага ўзроўню.

«Скарбоніца» заснавана ў канцы 1980-х гадоў. Сёння экспазіцыя складаецца з некалькі частак: «Археалогія», «Вялікая Айчынная вайна ў лёсе землякоў», «Дняпроўскі рубеж», «Землякі-афганцы», «Людзі мірнай працы», «Этнаграфія». Фонд змяшчае больш за 300 каштоўных рэчаў.

Штогод адбываюцца пешыя паходы-экскурсіі да помнікаў археалогіі, дзе аглядаецца іх стан, збіраюцца на паверхні зямлі артэфакты для папаўнення музейнага фонду.

У перспектыве — складанне электроннага каталога найбольш каштоўных экспанатаў; распрацоўка першага гісторыка-экалагічнага турыстычнага

маршрута, дзе цэнтральнае месца будзе адведзена Збараўскаму школьнаму музею; выданне кнігі па гісторыі вёскі; пошук месц баёў і ўшанаванне памяці салдат, загінуўшых на гэтай тэрыторыі летам 1941 года.


газета для подростков

ПЕРЕХОДНЫЙ ВОЗРАСТ

Грамота

награждается

**ГУО «Зборовский ясли-сад-средняя школа имени К.Н. Осипова»**

Гомельской области

за активное участие
в информационном проекте «Школьный музей»,
реализуемом газетой «Переходный возраст»
в рамках
республиканской акции
«Жыву ў Беларусі і тым ганаруся»

Главный редактор Ж.Г. Щурок

г. Минск, 2015 год